Падтрымай "Вясну" на PATREON

Мазыр: Пенсіянера ізноў збіраюцца судзіць за ўдзел у акцыі пратэсту

16.05.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Рыгор Крывіцкі ў судзе.

16 траўня 2017 года па тэлефоне быў выкліканы ў Мазырскі РАУС рэгіянальны каардынатар БНК, сябра Руху "За Свабоду" **Рыгор Крывіцкі.**

Капітан міліцыі **Яўген Пузанаў** склаў на пенсіянера Крывіцкага пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні па ч.2, арт. 23.34 КаАП РБ (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве).

Згодна з міліцэйскім пратаколам *“Крывіцкі Р.Л., не маючы дазволу Мазырскага райвыканкама па яго звароце ад 7 сакавіка 2017 года аб правядзенні масавага мерапрыемства на пл. Леніна - вул. Савецкая, 35 у Мазыры, г.зн. з'яўляючыся арганізатарам масавага мерапрыемства, 18 сакавіка каля 14:00 гадзін на пл. Леніна па вул. Савецкая г. Мазыра шляхам пераканання непаўналетніх Сярдзюка Г., Ясюгені Р., Гырна К., Сельвіча А. да распаўсюду на тэрыторыі г. Мазыра прадстаўленых ім агітацыйных улётак з заклікам да ўдзелу грамадзян у масавым мерапрыемстве 26.03. 2017 года, якія дадзенымі непаўналетнімі былі распаўсюджаныя на тэрыторыі г. Мазыра, публічна заклікаў грамадзян да ўдзелу ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве…”*

Трэба адзначыць, што за правядзенне масавага мерапрыемства 26 сакавіка, на якое насамрэч падаваў заяўку Р. Крывіцкі ў Мазырскі райвыканкам і атрымаў адтуль адмову, ён ужо быў пакараны Мазырскім раённым судом 11 красавіка штрафам у 20 б.в.. (460 рублёў). Гэтае спагнанне ён аспрэчваў у Гомельскім абласным судзе, які адбыўся 12 траўня. На суд у Гомель Рыгор Крывіцкі не ездзіў. Пенсіянеру - 73 гады, ён з’яўляецца інвалідам 2-й групы, хварэе на сэрца і рашэнне Гомельскага суда ён пакуль не атрымаў.

Верагодна, новы суд можа адбыцца цягам двух бліжэйшых дзён – 17 – 18 траўня.

Твитнуть





Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO





















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY